УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЧАРНАБРЫСАЎ ВІТАЛЬ ФЕАДОСЬЕВІЧ

## МАСТАК-АВАНГАРДЫСТ, СКУЛЬПТАР, ПЕДАГОГ

## 15 СНЕЖНЯ 1940 Г. ЦІ 1 СТУДЗЕНЯ 1941 Г. – 16 СТУДЗЕНЯ 2022 Г.

**ФОНД № 421**

**ВОПІС № 1**

**[1933], 1951–2019 ГГ.**

**МІНСК 2026**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 421**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ І РУКАПІСЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 1-24 | 1-2 |
| 2. | ПІСЬМЫ, ПАШТОЎКІ ДА В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА І ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ ЯМУ | 25-36 | 2-4 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 37-55 | 4-7 |
| 3.1. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА КІРАЎНІКОМ ДЗІЦЯЧАЙ СТУДЫІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА І МАСТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ "АРТЕЛЬ" | 37-45 | 4-5 |
| 3.2. | ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ, ГРАМАДСКАЙ І ІНШ. ДЗЕЙНАСЦІ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 46-53 | 5-7 |
| 3.3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 54-55 | 7 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ, ЯКІЯ АДКЛАЛІСЯ Ў ФОНДЗЕ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 56-62 | 7-8 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 63-69 | 8-9 |
| 6. | ДАКУМЕНТЫ СВАЯКОЎ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА | 70-71 | 9 |

# Прадмова

**Чарнабрысаў Віталь Феадосьевіч** нарадзіўся 15 снежня 1940 г. (па пашпарту 1 студзеня 1941 г.)[1] у г. Фрунзэ (цяпер г. Бішкек, Кыргыстан) у сям'і Феадосія Аляксандравіча і Надзеі Мікалаеўны. Калі яму было два гады сям'я распалася. Ранняе дзяцінства прайшло з айчымам, вядомым вучонымветэрынарам А.Т. Інюціным, пасля смерці якога (1946) маці пераехала ў Беларусь у г. Гомель і ўладкавалася на працу бібліятэкарам у ваеннае вучылішча, а ў 1951 г. забрала да сябе і сына, які дагэтуль жыў у яе бацькоў. У 1958 г., пасля новага замужжа маці, пераехалі ў г. Мінск. У 1961–1964 гг. В.Ф. Чарнабрысаў служыў у Савецкай арміі, дзе пазнаёміўся з ленінградскім паэтам М. Зарайскім і іншымі дзеячамі, якія адкрылі яму культуру заходняга і рускага авангарда. У 1966–1967 гг. вучыўся на афарміцельскім аддзяленні ў Каўнаскім тэхнікуме дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя С. Жукаса (цяпер Цэнтр навучання мастацтву і дызайну), адкуль быў адлічаны за непаспяховасць па агульным дысцыплінам. З 1968 г. пачаў весці заняткі ў дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва пры ЖЭСе Савецкага раёна г. Мінска. У 1972 г. працаваў начным вартаўніком у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР (цяпер Нацыянальны мастацкі музея Рэспублікі Беларусь). У 1972–1975 гг. па запрашэнню супрацоўніка гэтага музея Н.Ф. Высоцкай, ездзіў у экспедыцыі па Беларусі. У 1995 г. арганізаваў мастацкае аб'яднанне "Артель". Ініцыіраваў грамадскі праект "Благовест", які быў накіраваны на стварэнне мастацкаарганізаванага жылога асяроддзя (роспіс жылых дамоў, пад'ездаў, сацыяльных аб'ектаў). Быў членам розных арганізацый: эстэтычнай камісіі пры Саюзе мастакоў БССР (1978–1985), нефармальнага творчага аб'яднання "БЛО" (Мінск, 1987–1990), Санкт-Пецярбургскага гуманітарнага фонду "Свободная культура" (з 1990), мастацкай камісіі Музея дзіцячай творчасці ў г. Санкт-Пецярбургу (з 1993), Грамадскага аб'яднання Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане (з 2002), Усебеларускага аб'яднання казацтва.

Упершыню выстаўляў свае мастацкія творы г. Ленінградзе на кватэры мастака І.І. Сінявіна (1969). Удзельнік шматлікіх выстаў у Беларусі і Расіі. Працаваў у тэхніцы жывапісу, графікі, ствараў каменныя скульптуры, пісаў вершы і інш. Творы мастака знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным архівемузеі літаратуры і мастацтва, Веткаўскім музеі стараабрадства і беларускіх традыцый імя Ф.Г. Шклярова (Гомельская вобласць), Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (г. Масква), Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Літаратурна-мемарыяльным музеі Ф.М. Дастаеўскага і музеі нонканфармісцкага мастацтва (г. Санкт-Пецярбург) і інш. А таксама ў прыватных калекцыях г. Санкт-Пецярбурга (М.І. Благадатава,

[1] Ф. 421, Воп. 1, Спр. 24. Аўтабіяграфія В.Ф. Чарнабрысава "По дорогам памяти"

Л.Б. Каценельсона, С.Ю. Ліпшыца, Б.Ш. Файзуліна), г. Мінска (Г. Балаш, А. Клінава, Я. Ксеневіча, Д. Парнюка, А. Плесанава) і інш.

Памёр Віталь Феадосьевіч Чарнабрысаў 16 студзеня 2022 г. Пахаваны ў г. Мінску.

Дакументы Чарнабрысава Віталя Феадосьевіча паступалі ў БДАМЛМ ад яго самога ў 1997 г, 1998 г., 2012 г. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 71 адзінак захоўвання (368 дакументаў) за [1933], 1951–2019 гг.

Вопіс складаецца з шасці разделаў.

У першы раздзел "Творчыя працы і рукапісы В.Ф. Чарнабрысава" ўвайшлі яго аўтапартрэты і карціны "Актриса", "Ветеран", "Диоген", "Маленький портрет большого писателя", "Пан полковник", "Торговая точка", замалёўкі з экспедыцыі па Беларусі, фатаграфіі каменных скульптур, яго артыкулы, вершы і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе (1972–2019).

Другі раздзел "Пісьмы, паштоўкі да В.Ф. Чарнабрысава і дароўныя надпісы яму" складаецца з пісьма Т.М. Мікуцкай, паштовак У.Б. Сосінскага і дароўных надпісаў, змешчаных у гэтым раздзеле па алфавіце прозвішчаў іх аўтараў: А.М. Арлова, М.М. Аршукова, Л.П. Далінскага (Прыходзькі), І.В. Іванова, С.Я. Краснабарода, Б.Ю. Панізоўскага, Н.А. Собалевай, М.П. Чайкіна, М.А. Якімчука (1978–2013).

Трэці раздзел "Дакументы да біяграфіі В.Ф. Чарнабрысава" падзяляецца на тры падраздзелы: дакументы аб працы В.Ф. Чарнабрысава кіраўніком студыі выяўленчага мастацтва і мастацкага аб'яднання "Артель", дакументы творчай, грамадскай і інш. дзейнасці і дакументы пра В.Ф. Чарнабрысава. Справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе (1970–2012).

Чацвёрты раздзел "Дакументы, якія адклаліся ў фондзе В.Ф. Чарнабрысава", справы ў якім сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе [1933–2000-я гг.].

Пяты раздзел "Выяўленчыя дакументы В.Ф. Чарнабрысава" – гэта яго фатаграфіі, індывідуальныя і ў групах з К.У. Зеляным, І.А. Кашкурэвічам, мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічнам прынцыпе (1971–2008).

Шосты раздзел склалі дакументы сваякоў В.Ф. Чарнабрысава, справы ў якім сфарміраваны па храналогіі (1951–1990).

Прадмову склала
вядучы архівіст
12.05.2026 Г.Б. Багамолава

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ
ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

ЗАЦВЕРДЖАНА

ФОНД № 421
ВОПІС № 1
[1933], 1951-2019

ПАТАКОЛ ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2026 г.
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ І РУКАПІСЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 1 | Замалёўкі В.Ф. Чарнабрысава, зробленыя ім падчас экспедыцыі па Беларусі.<br>Блакноты, шарыкавая ручка | 1972-1975 | 96 | 3/101 | |
| 2 | Альбом "Глубинка Беларуси карандашом Виталия Чернобрисова 1973-1974 г.".<br>Ксеракопія з падрыхтаванага выдання | 1997 | 11 | 1/59 | |
| | *** | | | | |
| 3 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэты і інш.<br>Папера, туш, пяро | [1970-я - 1990-я гг.] | 17 | 17 | |
| 4 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт I.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 5 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт II.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 6 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт III.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 7 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт IV.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 8 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт V.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 9 | В.Ф. Чарнабрысаў. Аўтапартрэт VI.<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 10 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Ветеран".<br>ДВП, алей | 1993 | 1 | 1 | |
| 11 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Актриса".<br>ДВП, алей | 1994 | 1 | 1 | |
| 12 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Торговая точка".<br>ДВП, алей | 1997 | 1 | 1 | |
| 13 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Маленький портрет большого писателя". | 1998 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | ДВП, алей | | | | |
| 14 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Диоген".<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 15 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Конокрад".<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 16 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Пан полковник".<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 17 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Порт".<br>ДВП, алей | [1990-я - 2000-я гг.] | 1 | 1 | |
| 18 | В.Ф. Чарнабрысаў. Малюнкі з выявай аб'ектаў і элементаў драўлянага дойлідства.<br>Папера, графітавы і каляровыя алоўкі | [1990-я - 2000-я гг.] | 7 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 19 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Гетман", "Кукла-актриса".<br>Ксеракопіі малюнкаў і рэкламны буклет Ленінградскай галерэі з карцінай мастака | 1989, 1997 | 4 | 3 | |
| 20 | В.Ф. Чарнабрысаў. "Жар птица", "Каменный цветок", "Слонёнок", "Солнышко" і інш.<br>Фатаграфіі і ксеракопія эскіза каменных скульптур | 1999-2006, 2019 | 11 | 11 | |
| | *** | | | | |
| 21 | В.Ф. Чарнабрысаў "Наша среда проживания (раздумья в стиле "ретро")", "Работая с камнем, преодолеваешь временной барьер" і інш. Артыкулы і інш.<br>Чарнавы аўтограф, кампутарны выдрук, выразкі з газет і ксеракопія з часопіса "Монолог" № 1 | 1982 -2001 | 18 | 5 | |
| 22 | В.Ф. Чарнабрысаў "Фрагменты из жизни Пьеро". Вершы (6) і графіка (6).<br>Самаробнае друкаванае выданне | 2001 | 10 | 1 | |
| 23 | В.Ф. Чарнабрысаў "Настойка застоя". Вершы, графіка і інш.<br>Самаробнае друкаванае выданне | 2002 | 44 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 24 | В.Ф. Чарнабрысаў "По дорогам памяти".<br>Аўтабіяграфія.<br>Машынапіс | 30.10.1998 | 11 | 1 | |

## 2. ПІСЬМЫ, ПАШТОЎКІ ДА В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА І

| №№ п/п | Загалоўкі справ | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ ЯМУ** | | | | |
| 25 | Пісьмо ад Т.М. Мікуцкай, паштоўкі ад У.Б.Сосінскага і інш. В.Ф. Чарнабрысаву | 1978-1997 | 15 | 8 | |
| | *** | | | | |
| 26 | Дароўны надпіс А.М. Арлова В.Ф. Чарнабрысаву ад 15.05.2013 г. на афішы свайго навуковага даклада на тэму "Живописные реквизиты садоводства и огородничества на Полесье" (з кароткім зместам даклада).<br>На Лл. 2-5 - кампутарны выдрук з тэкстам гэтага даклада | | 5 | 2 | |
| 27 | Дароўны надпіс М.М. Аршукова В.Ф. Чарнабрысаву ад 29.06.2000 г. на кнізе сваіх вершаў "Так не бывает. И всё-таки…" (1996-1997) | | 21 | 1 | |
| 28 | Дароўныя надпісы Л.П. Далінскага (Прыходзькі) В.Ф. Чарнабрысаву на буклеце выстаўкі сваіх творчых прац (1992) і кампутарным выдруку інтэрнэт-старонкі выставы "Судьбы репрессированных ленинградцев" (2001) | | 6 | 2 | |
| 29 | Дароўны надпіс І.В. Іванова В.Ф. Чарнабрысаву ад 19.05.1988 г. на праспекце сваёй выставы жывапісу "Мистерия цвета" | | 3 | 1 | |
| 30 | Дароўны надпіс Б. Ковача (Bohuslav Kovac) В.Ф. Чарнабрысаву ад 30.03.1996 г. на ксеракопіі тытульнай старонкі сваёй кнігі "Citanie ako experimentovanie s moznostami stastia, cize o literarnej kulture pubescentov" ("Чытанне як эксперымент з магчымасцямі шчасця, або пра літаратурную культуру падлеткаў") | | 1 | 1 | |
| 31 | Дароўны надпіс С.Я. Краснабарода В.Ф. Чарнабрысаву на кнізе сваіх вершаў "Стихотворения Сергея Краснобородa" (2000) | | 58 | 1 | |
| 32 | Дароўны надпіс Б.Ю. Панізоўскага В.Ф. Чарнабрысаву на ўлётцы з праграмай Міжнароднага моладзевага фестывалю "Новые лица" [пач. 1990-х гг. - да чэрвеня 1995 г.] | | 1 | 1 | |
| 33 | Аўтограф Н.А. Собалевай ад мая 2000 г. на кнізе сваіх вершаў "Грушевый цвет" (1998) | | 17 | 1 | |
| 34 | Дароўны надпіс І.Л. Табенкіна В.Ф. Чарнабрысаву ад 10.08.1985 г. на буклеце выставы сваіх творчых прац | | 3 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 35 | Дароўны надпіс М.П. Чайкіна В.Ф. Чарнабрысаву ад 6.02.1978 г. на афішы выставы "Отчизны верные сыны" | | 1 | 1 | |
| 36 | Дароўны надпіс М.А. Якімчука В.Ф. Чарнабрысаву на кнізе сваіх вершаў "Следы в воздухе. Царскосельские хокку" (1996) | | 22 | 1 | |

**3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА**

**3.1. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА КІРАЎНІКОМ ДЗІЦЯЧАЙ СТУДЫІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА І МАСТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ "АРТЕЛЬ"**

Дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 37 | Ганаровыя граматы Мінскага гарадскога савета педагагічнага таварыства БССР, гарадскога аддзела народнай адукацыі і інш. В.Ф. Чарнабрысаву за працу па мастацка-эстэтычнаму выхаванню дзяцей і інш. і дыплом першай ступені Міністэрства асветы БССР кіраўніку выяўленчага гуртка ЖЭС № 33 В.Ф. Чарнабрысаву за актыўны ўдзел у рэспубліканскай выставе выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва навучэнцаў | 1975-1988 | 16 | 8 | |
| 38 | Дакументы аб удзеле В.Ф. Чарнабрысава, як кіраўніка дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва, ў мастацкай выставе "Мир детей" у Маладзечна, семінары па дзіцячай творчасці ў Мінскім гарадскім доме ўдасканалення выкладчыкаў, мерапрыемствах, прысвечаных году сям'і ў Гомелі і інш. (афішы і запрашэнне, справаздача, фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава ў групе з Л.Х. Быстрэнінай, У.Л. Конанавым, Р.А. Маем, М.П. Чайкіным, Епіскапам Гомельскім Арыстархам, начальнікам Гомельскага аддзела культуры А.Р. Маісеянкам і інш.) | 1978-1979, 1991 | 12 | 11 | |
| 39 | Падзякі Гомельскага абласнога Інстытута ўдасканалення настаўнікаў, СШ № 93 г. Мінска В.Ф. Чарнабрысаву за актыўны ўдзел у семінары настаўнікаў, за мастацкае афармленне школы і падзяка Дабрачыннага фонда сацыяльнага развіцця і аховы творчасці начальніку ЖРЭА Першамайскага раёна г. Мінска за падтрымку студыі выяўленчага мастацтва В.Ф. Чарнабрысава і інш. | 1986-1996 | 6 | 6 | |

***

| №№ п/п | Загалоўкі справ | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 40 | Т. Красікава "Подарить красоту", В. Кулік "Окна в детство", Р. Раманава "Всё начинаентся с детсва" і інш.<br>Артыкулы і нататкі пра В.Ф. Чарнабрысава і са згадкай пра яго як кіраўніка дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва і інш.<br>Выразкі і ксеракопія з газет | 1976-1994 | 5 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 41 | Фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава з вучнямі студыі выяўленчага мастацтва падчас заняткаў і на выставах гэтага гуртка і інш. Дзве фатаграфіі з выявай мастацтвазнаўца К.У. Зелянога | 1969-1982 | 18 | 18 | |
| | Мастацкае аб'яднанне "Артель" | | | | |
| 42 | Дакументы аб дзейнасці мастацкага аб'яднання "Артель" (праект "Экспериментальная программа экологической и эстетической оптимизации среды проживания по схеме "Школа-дом"; запрашэнне і прэс-рэліз выставы "Сделай сам"; дароўныя акты на мастацкія працы; заява аб'яднання "Артель" у "Гуманитарный фонд Содружества" аб членстве і рашэнне фонду аб іх прыняцці; падзяка аб'яднанню за роспіс сцен жылых дамоў і інш.) | 1995-1997 | 29 | 18 | |
| 43 | М. Іовенка "Масты" Віталя Чарнабрысава", А. Казакова "Фрески для подъезда, где живут ветераны", С. Кірсанава "Як злавілі райскую птушку", М. Куноўская "Культура - дело "артельное" і інш. Артыкулы пра дзейнасць мастацкага аб'яднання "Артель" і са згадкай В.Ф. Чарнабрысава.<br>Выразкі і ксеракопіі з друкаваных выданняў, машынапіс | 1997-2005 | 7 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 44 | Фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава з удзельнікамі мастацкага аб'яднання "Артель" на фоне распісанай імі сцяны каля кінатэатра "Вільнюс" у г. Мінску, падчас творчых выстаў і інш. | 1995-1997 | 17 | 17 | |
| 45 | Фатаграфіі з роспісам пад'ездаў г. Мінска мастацкім аб'яднаннем "Артель" | 1995-1998 | 21 | 21 | |
| | **3.2. ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ, ГРАМАДСКАЙ І ІНШ. ДЗЕЙНАСЦІ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 46 | Дыпломы пераможцы і ўдельніка выстаўкі-конкурса | 1970 - [1980-я гг.], | 5 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | самадзейных мастакоў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і народных майстроў-умельцаў Беларусі і ксеракопія граматы БРСМ за актыўны ўдзел у арганізацыі абласнога форума пакаленняў "Путь длиною 90 лет" на імя В.Ф. Чарнабрысава | 2008 | | | |
| 47 | Падзякі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР В.Ф. Чарнабрысаву за добрасумленную працу ў сувязі з міжнародным днём музеяў і ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР | 1982, 1984 | 2 | 2 | |
| 48 | Афіша выставы жывапісу В.Ф. Чарнабрысава ў Літаратурна-мемарыяльным музеі Ф.М. Дастаеўскага ў г. Ленінградзе і буклеты выставы каменнай скульптуры В.Ф. Чарнабрысава і выстаў мастацкіх твораў з калекцыі М.І. Благадатава (са згадкай работ В.Ф. Чарнабрысава) | 1991-2001 | 11 | 4 | |
| 49 | Дакументы аб удзеле В.Ф. Чарнабрысава ў перакладзе і публікацыі кнігі Б. Ковача "Чудесный мир детских рисунков" з славацкай на рускую мову (пісьмо і дазвол Б. Ковача В.Ф. Чарнабрысаву на публікацыю сваёй манаграфіі выдавецтвам "Школа" ў г. Мінску; друкаваныя выданні гэтай кнігі на рускай мове і інш.) | 1992-1998 | 56 | 6 | |
| 50 | Акты Гомельскага абласнога краязнаўчага музея, Літаратурна-мемарыяльнага музея Ф.М. Дастаеўскага (г. Санкт-Пецярбург), Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і інш. на прыём у дар і пастаяннае захоўванне мастацкіх прац і інш. В.Ф. Чарнабрысава | 1993-2008 | 14 | 14 | |
| | *** | | | | |
| 51 | Дакументы аб членстве В.Ф. Чарнабрысава ў "Всебелорусском объединённом казачестве", Гуманітарным фондзе "Свободная культура", камісіі Музея дзіцячай творчасці ў г. Санкт-Пецярбургу і інш. (пасведчанні аб членстве, падзякі за працу, дагавор дарэння сваіх прац і інш.) | 1992-2002 | 25 | 12 | |
| 52 | Дакументы аб працы В.Ф. Чарнабрысава дарадцам па культуры Партызанскай раённай арганізацыі г. Мінска Грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане" (ксеракопіі заявы на членства ў арганізацыі і ўліковай карткі; дакументы аб перадачы ў дар сваіх прац Выканкаму г.п. Смілавічы, Савецкаму раёну г. Гомеля, СШ в. Вялікае Сяло Дзяржынскага раёна і інш.; дакументы | 2002-2012 | 38 | 31 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | аб творчым праекце "Благовест" і інш.) | | | | |
| | *** | | | | |
| 53 | Дакументы да юбілейных дат В.Ф. Чарнабрысава і інш. (буклет і каталог персанальнай выставы "Я не один" да 60-годдзя з дня нараджэння і інш.; запрашэнне Міністэрства культуры і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь на выставу "Это было недавно…", прысвечаную мастакам-юбілярам 2011 г. (з удзелам В.Ф. Чарнабрысава) | 2001-2011 | 24 | 6 | |
| | **3.3. ДАКУМЕНТЫ ПРА В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 54 | К.У. Зеленой "Между числом и словом", В. Капёнкіна "Пад дахам "Зялёнага дома", Н.М. Усава "Віталь Чарнабрысаў у люстэрку мінскага авангарда. Жыццяпіс мастака-нонканфарміста" (поўны тэкст) = "Віталь Чарнабрысаў. Рэпрэзентатыўны партрэт мастака-нонканфарміста" (скарочаны тэкст), М. Шэвелеў "Влюблённый в камень" і інш. Артыкулы пра В.Ф. Чарнабрысава і з яго згадкай.<br>Машынапіс з праўкай і дапіскамі, выразкі і ксеракопіі з друкаваных выданняў.<br>Пытанні на адказы анкеты Д.С. Калініна (са згадкай В.Ф. Чарнабрысава) (1994) | 1990-2005 | 38 | 9 | |
| 55 | Пісьмы ад пецярбургскіх калекцыянераў Ю.М. Позіна, А.М. Сідарава, Б.Ш. Файзуліна і інш. да Н.М. Усавай са спісамі творчых прац В.Ф. Чарнабрысава, якія знаходзяцца ў іх калекцыях; пісьмо Н. Зіцеравай у "Гуманитарный фонд содружества независимых государств" аб выданні альбома па мастацтву мастакоў андэграўнда (са згадкай В.Ф. Чарнабрысава).<br>На Лл. 13-14 - буклет выставы жывапісу і графікі В.Ф. Чарнабрысава ў музеі-кватэры Ф.М. Дастаеўскага (Ленінград, 1991) з прадмовамі М.І. Благадатава і Б.Ш. Файзуліна; на Лл. 15-18 - ксеракопія анкеты, запоўненай В.Ф. Чарнабрысавым у 1992 г. | 1997 | 22 | 7 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ, ЯКІЯ АДКЛАЛІСЯ Ў ФОНДЗЕ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 56 | Ілюстрацыі малюнкаў А. Масона (Andre Masson) з серыі "Massacres" ("Разня") (1933), змешчаныя побач з тэкстам эсэ П. Элюара (Paul Eluard) "Le Miroir de Baudelaire" ("Люстэрка Бадлера"). Выразка з часопіса "Minotaure" ("Мінатаўр") | [1933] | 2 | 1/3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 57 | І.В. Іваноў. "Кукла Маша".<br>Холст, наклеены на фанеру, алей | 1987 | 1 | 1 | |
| 58 | К.У. Зеляны. "Круг Хомы Брута". Эсэ.<br>Друкаванае выданне | 1998 | 18 | 1 | |
| 59 | С.Я. Краснабарод "Стихотворения". Падборка да мяркуемага зборніка.<br>Машынапіс | [1990-я - пач. 2000-х гг.] | 44 | 1 | |
| 60 | Буклеты мастацкіх выстаў А. Арэф'ева, С.М. Гершова, Ю.А. Мядзведзева, Ш.А. Шварца, Цэнтра сучаснага мастацтва "Ковчег XXI века" (г. Санкт-Пецяргург); запрашэнне і праграма XXII Міжнародных чытанняў "Достоевский и мировая культура" і інш. | 1989-1998, [2000-я гг.] | 39 | 11 | |
| 61 | Буклет рэтраспектыўнай выставы да 10-годдзя творчага аб'яднання "Митьки" з фатаграфіяй яго ўдзельнікаў (В.А. Голубева, А.А. і В.А. Фларэнскіх, А.А. Філіпава, В.І. Ціхамірава, Д.В. Шагіна, У.М. Шынкарова, У.Я. Яшке і інш.).<br>Фатаграфіі прадстаўніка творчага аб'яднання "Митьки" У.Я. Яшке падчас выставы гэтага аб'яднання ў Маскве | 1993, 1998 | 6 | 5 | |
| 62 | Пісьмы Беларускага фонду культуры, Дома культуры Беларускага таварыства глухіх (г. Гомель) да калекцыянера М.І. Благадатава і інш. аб выстаўцы мастацкіх прац з яго калекцыі; фрагмент інтэрв'ю М.І. Благадатава (ксеракопія з друкаванага выдання) | 1996-1998 | 4 | 4 | |
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 63 | Фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава, індывідуальныя.<br>Арыгіналы і кампутарны выдрук | 1971-2005 | 11 | 11 | |
| 64 | Фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава з айчымам Б.Р. Чарнухам і ў групах з К.У. Зеляным, І.А. Кашкурэвічам, І. Пачаткам (Izidor Pociatek) (пасол Славакіі ў Беларусі), мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам і інш. на вечары беларуска-славацкага сяброўства ў "Доме дружбы" ў г. Мінску, на свяце 850-годдзя г. Дзяржынска, на выстаўцы камянёў у г. Заслаўі і інш. | 1956, 1994-1997 | 8 | 8 | |
| 65 | Фатаграфіі В.Ф. Чарнабрысава з жыхарамі вёскі Вялікае Сяло падчас устаноўкі зробленага ім каменнага крыжа ў цэнтры вёскі | 2008 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 66 | Фатаграфіі саслужыўцаў В.Ф. Чарнабрысава | 1961, 1962 | 2 | 2 | |
| 67 | Фатаграфіі мастака Л.П. Далінскага (Прыходзькі), перакладчыка А. Коца з унукам | 1975, 1997 | 2 | 2 | |
| 68 | Фатаграфіі творчых прац Л.П. Далінскага (Прыходзькі): трыпціха "Реквием" (1989-2000) і скульптуры "Первые жертвы комфашизма" (1998) | | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 69 | Фатаграфіі з выявай гісторыка-культурных аб'ектаў г. Віцебска звязаных з жыццём М. Шагала (дом-музей М. Шагала, помнік М. Шагала на вуліцы Пакроўскай, руіны Вялікай Любавічскай сінагогі і інш. | [1990-я гг.] | 12 | 12 | |
| | **6. ДАКУМЕНТЫ СВАЯКОЎ В.Ф. ЧАРНАБРЫСАВА** | | | | |
| 70 | Фатаграфіі Ф.А. Смірновай (Сердзюковай) (бабулі В.Ф. Чарнабрысава) у групах з вучнямі і настаўнікамі школы № 6 г. Фрунзе (цяпер г. Бішкек, Кыргыстан) | 1951, 1955 | 6 | 5 | |
| 71 | Дакументы Н.М. Інюцінай і Б.Г. Чарнухі (маці і айчыма В.Ф. Чарнабрысава): білет удзельніка Усесаюзнай нарады пісьменнікаў і крытыкаў на тэму "Бессмертный подвиг советского народа в Великой Отечественной войне и советская литература" на імя Н.М. Інюцінай; пісьмо Н.М. Інюцінай да Ч.Т. Айтматава; фатаграфіі Н.М. Інюцінай і Б.Г. Чарнухі; ксеракопія некралога А.Т. Інюціна (другі муж Н.М. Інюцінай) з часопіса "Ветеринария" № 1 за 1947 г. | [1950-я - 1960-я гг.], 1975-1990 | 14 | 7 | |

У дадзены вопіс унесена 71 (семдзесят адзін)

спраў з № 1 па № 71 , 368 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда
зрабіла вядучы архівіст аддзела
навуковага апісання дакументаў
асабістага паходжання

2026 г.

Г.Б. Багамолава

Дакументы прынялі:

вядучы архівіст аддзела
забеспячэння
захаванасці дакументаў

В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.